будзе, дык добра было–б, грэбень каб ты падала, а то няма чым расчасацца. Адчуваюся добра. Рад, што наведала. Цалуй ад мяне дзетак. Ня сумуйце. Цалую цябе.

*Адам.*

## № 23. Ганьне Бабарэцы

*[1930]*

За падтрыманьне харчамі я ўжо ня ведаю, як і дзякаваць. Любая Анечка, толькі глядзі не аднімай ад дзяцей для мяне. Я ўжо загартаваўся, і калі ты прысылацьмеш крыху хлеба, гародніны, я буду здаволен і ўдзячан. Глядзі, любая, каб нашы дзеці не дасталі малакроўя, каб ня сталі хілымі і не аслаблі. А таксама, любая, і сябе глядзі, бо ты–ж цяпер для ўсіх нас усё. На табе цяпер усё трымаецца. Глядзі не перасільвайся і не іcташчай сябе. Анечка, ці ў нас яшчэ Ніна, ці ты адправіла ўжо яе? Ці прыяжджаў калі Ігнась?

Вітаю і моцна–моцна цалую цябе, любая Анечка.

Твой навек

*Адам.*

## № 24. Ганьне Бабарэцы

*[1930]*

Дарагая і любая Анечка!

З прошласуботняе перадачы атрымаў тры лусты хлеба, тры скрылікі сала і кавалачак кілбасы. Шчыра дзякую, любая. Кніг яшчэ не атрымаў.

Я здароў, моцны і бадзёры. Ці здаровы вы ўсе? Як гадуюцца і растуць нашы слаўныя дзетанькі — Лорачка і Лялячка?

Ці атрымала ты, Анечка… *[абарвана]*

## № 25. Ганьне Бабарэцы

*14/X–1930 г.*

Дарагая Анечка!

Перасылаю брудную бялізну —
Кальсон — 7.
Сарочак — 6.
Сетка — 1.
Шкарпэтак — 8 пар.
Хустачак — 3.
Наўлачак — 3.
Ручнікоў — 3.
Просьцін — 2.